# Абмен вопытам дапамагае рухацца наперад

***Абмен вопытам, ідэямі і меркаваннямі - тое, што дапамагае рухацца наперад любой галіне. Як ніхто, ведаюць аб гэтым бібліятэкары, бо тут, у храме кніг, амаль ніколі не сціхае палеміка. Акрамя таўсценных энцыклапедый, рэдкіх фаліянтаў і танюсенькіх часопісаў, тут заўсёды «жывуць» уражанні, думкі, погляды ўдзячных і неабыякавых чытачоў, якія нягледзячы на сямімільныя крокі прагрэсу не здрадзілі свайму лепшаму сябру - звычайнай папяровай кнізе. Аб гэтым сведчаць хаця б такія лічбы: бібліятэкі раёна абслугоўваюць больш як 21 тысячу чытачоў у год.***



Каб гэтак было і надалей, каб чытачы не страцілі гэтай сваёй прыхільнасці, бібліятэкары раёна ўвесь час шукаюць новыя формы работы, якія дапамагаюць падтрымліваць цікавасць да сваёй установы як да асяродка культуры, ведаў. Штосьці прапануюць самі, штосьці падказваюць наведвальнікі, нейкімі напрацоўкамі дзеляцца падчас сустрэч калегі.

На мінулым тыдні на базе бібліятэчных устаноў Ашмянскага раёна прайшоў абласны семінар «Публічныя бібліятэкі сёння: традыцыі і стратэгія развіцця». Знаёміцца з вопытам калегаў прыехалі дырэктары бібліятэчных устаноў Гродзенскай вобласці, прадстаўнікі часопісаў «Вожык» і «Полымя». Удзел у семінары прынялі таксама першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, спецыялісты абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага, прадстаўнікі Ашмянскага райвыканкама.



Знаёмства з раёнам і яго культурным асяроддзем пачалося ў раённай бібліятэцы. Візітную картку Ашмяншчыны прадставілі намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Саванец і выконваючы абавязкі начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Людміла Каханоўская.

З бібліятэчнай сістэмай Ашмяншчыны прысутных пазнаёміла дырэктар раённай бібліятэкі Марына Белавус, якая расказала аб дзейнасці ўстаноў, асноўных напрамках іх развіцця, цікавых знаходках і планах на будучыню. Тут жа прайшло абмеркаванне праектнай дзейнасці, на якой апошнім часам засяроджана ўвага бібліятэкараў. Сваімі напрацоўкамі ў гэтым накірунку падзяліліся Марына Белавус, а таксама дырэктар абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага Лідзія Мальцава і яе намеснік Алег Кудрашоў.

- Рэалізацыя культурных міжнародных праектаў, - зазначыла Марына Белавус, - дазваляе наладжваць партнёрскія сувязі, пашыраць сацыяльныя магчымасці бібліятэкі, стымуляваць краязнаўчую дзейнасць бібліятэкараў. Дзякуючы такім інавацыйным метадам работы у нас з'явіўся музей Дугі Струвэ ў Гальшанах. Раённая бібліятэка прыняла ўдзел у рэалізацыі праекта па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны «Два бакі - адна гісторыя і культура». У рамках мерапрыемстваў гэтага праекта бібліятэкары раёна ўдзельнічалі ў прыгранічным фестывалі «Вясна паэзіі», які ладзіўся ў в. Барэйкішкі (Літоўская Рэспубліка), абменьваліся вопытам з латвійскімі і літоўскімі калегамі падчас візітаў.

Праект «Стварэнне і дзейнасць клуба старастаў вёсак «КУТ», які быў рэалізаваны на базе сельскай бібліятэкі аграгарадка Кальчуны, - працягнула дырэктар Ашмянскай раённай бібліятэкі, - накіраваны на культурна-інфармацыйнае абслугоўванне аддаленых населеных пунктаў, інфармацыйную падтрымку інвалідаў і сталых людзей.

Нарэшце, праект «Нявесцін камень» уключыў у сябе добраўпарадкаванне тэрыторыі, правядзенне краязнаўчай экспедыцыі па зборы фальклорнага матэрыялу аб аб'екце, правядзенне навуковай канферэнцыі і тэатралізаваную прэзентацыю новага турыстычнага аб'екта.

Пазнаёміцца з вынікамі рэалізаваных праектаў, задаць пытанні каардынатарам бібліятэчныя работнікі вобласці змаглі падчас другой часткі семінара. Ім прапанавалі наведаць сельскія бібліятэкі аграгарадкоў Кальчуны і Гальшаны, дзе загадчыкі Алена Шкелда і Алёна Юневіч расказалі пра вопыт работы сваіх устаноў, а таксама пабываць на аб'ектах культуры і турызму, якія набылі папулярнасць дзякуючы рэалізацыі праектаў.

Цікавую форму работы прапанавалі ўдзельнікам семінара супрацоўнікі раённай дзіцячай бібліятэкі. Аб сваёй дзейнасці бібліятэкары Яніна Абашкіна, Марыя Свірская, Кацярына Кавель і Святлана Красоўская расказалі прысутным у форме казкі.

Падчас семінара былі ўзнагароджаны пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка - асяродак нацыянальнай культуры». Ашмянская раённая бібліятэка атрымала дыплом пераможцы абласнога конкурсу на лепшы электронны інфармацыйны рэсурс, створаны публічнымі бібліятэкамі Гродзенскай вобласці.

Парады, метадычныя рэкамендацыі, якія атрымалі ў гэты дзень работнікі бібліятэчнай сістэмы вобласці, для многіх стануць добрымі падказкамі ў напісанні праектаў і арганізацыі дзейнасці па прыцягненні цікавасці да бібліятэкі.

**Людміла КОЗЕЛ.**
**Фота Святланы МУЦЯНСКАЙ.**